А БАТАРЭЙКІ — У СПЕЦЫЯЛЬНЫ КАНТЭЙНЕР

Падводзім вынікі нашай трэцяй апытанкі на экалагічную тэму

У першым пытанні мы папрасілі чытачоў адказаць, якія ж віды адходаў яны сартуюць. Большасць рэспандэнтаў раздзяляюць паперу, пластык, шкло і небяспечнае смецце — батарэйкі і ртутныя лампы. Такіх назбіралася прыкладна 2/3. Крыху меней людзей сартуюць метал і старыя рэчы. А дваццаць працэнтаў рэспандэнтаў займаюцца гэтым у дачыненні да арганічных адходаў — травы і старога лісця.

Пільныя чытачы заўважаць, што калі скласці гэтыя лічбы, то атрымаецца перавышэнне ста працэнтаў. Усё правільна: справа ў тым, што гэтае пытанне прадугледжвала магчымасць некалькіх варыянтаў адказу.

А вось наступны вынік прыемна парадаваў. Тры чвэрці рэспандэнтаў стараюцца выкарыстоўваць чыстыя пакеты некалькі разоў. Шостая частка апытаных і ўвогуле карыстаецца торбамі, зробленымі з экалагічна чыстых матэрыялаў.

Яшчэ адзін важны аспект — правільная ўтылізацыя адпрацаваных батарэек. Гэты металічны цыліндр змяшчае ў сабе шмат цяжкіх і шкодных металаў, якія забруджваюць навакольнае асяроддзе: свінец, нікель, цынк, марганец, кадмій. Адна батарэйка можа забрудзіць да дваццаці квадратных метраў тэрыторыі!

Некалькі гадоў таму ў гандлёвых пунктах пачалі з'яўляцца спецыяльныя кантэйнеры, у якія можна выкінуць нерабочыя батарэйкі. І гэта прынесла свае вынікі: тры чвэрці ўдзельнікаў апытання выбіраюць менавіта такі шлях пазбаўлення ад небяспечнага смецця. А 8 % апытаных стараюцца карыстацца акумулятарамі, якія можна перазарадзіць дзясяткі разоў.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

Наш інтэрактыўны праект з чытачамі працягваецца. Даведацца, наколькі мы «экасвядомыя», можна з нашай новай апытанкі

1. Ці лічыце вы, што за несартаванне смецця трэба ўводзіць сістэму штрафаў?

☐ Так, гэтая мера палепшыць экалогію ў горадзе/краіне/свеце.

☐ Не. Няхай пра гэта думае дзяржава.

☐ Гэта заўчасная мера. Калі будзе ў кожным двары дастатковая колькасць кантэйнераў для сартавання смецця, тады пра гэта можна гаварыць.

2. Ці трэба заахвочваць грамадзян за разабранае смецце?

☐ Так, гэта будзе стымуляваць людзей сартаваць смецце.

☐ Не, гэта справа сумлення кожнага.

3. Якую сыравіну вы звычайна здаяце і атрымліваеце за гэта грошы?

☐ Макулатура.

☐ Поліэтылен, ПЭТ-бутэлькі.

☐ Шклатара.

☐ Зношаныя шыны.

☐ Лом чорных/каляровых металаў.

☐ Тэкстыль.

☐ Бытавая тэхніка.

☐ Адпрацаваная аліва.

☐ Ртутныя лампы, батарэйкі.

4. У якім населеным пункце вы жывяце?

☐ Мегаполіс (сталіца, абласны горад).

☐ Невялікі раённы горад.

☐ Пасёлак, аграгарадок, вёска.

5. Узрост

☐ 15—20 гадоў.

☐ 20—30 гадоў.

☐ 30—45 гадоў.

☐ 45—60 гадоў.

☐ 60+.

Скарыстайцеся сваім смартфонам, каб адсканаваць QR-код і прыняць удзел у апытанцы.

ТЭХНАЛОГІІ ЛЮБЯЦЬ ІНІЦЫЯТЫЎНЫХ

АГУЛЬНАЯ СПРАВА

Як Браслаў стаў безвугляроднай сталіцай Беларусі?

Тры гады таму гэты раён паставіў сабе за мэту стаць кліматычна нейтральным муніцыпалітэтам. Рэцэпт «стравы» — сучасныя тэхналогіі плюс супрацоўніцтва мясцовай улады з грамадскасцю.

У 2014 годзе Браслаўскі раён падпісаў «Пагадненне мэраў па клімаце і энергіі». З гэтага часу тут рэалізуюцца розныя мерапрыемствы і праекты, накіраваныя на павышэнне энергаэфектыўнасці рэгіянальнай эканомікі. Сёлета завяршаецца адзін з іх — праект міжнароднай тэхнічнай дапамогі «Браслаўскі раён — першы кліматычна нейтральны муніцыпалітэт у Беларусі». Ён фінансуецца Еўрапейскім саюзам і рэалізуецца Браслаўскім райвыканкамам, установай «Цэнтр экалагічных рашэнняў» (ЦЭР) і КУП ЖКГ «Браслаў-камунальнік». Што атрымалася зрабіць за гэты час, каб наблізіцца да жаданай мэты?

«Зялёнае» цяпло

Рэканструкцыя кацельні ЦМУ (ТМО) КУП ЖКГ «Браслаў-камунальнік» стала адным з асноўных мерапрыемстваў праекта. Гэты аб'ект забяспечвае цяплом і гарачай вадой адзін з мікрараёнаў горада, дзе размешчаны каля 30 аб'ектаў, у тым ліку Браслаўская цэнтральная раённая бальніца, адміністрацыйныя будынкі і жылы фонд.

У межах праекта ў кацельні прайшла рэканструкцыя, было заменена абсталяванне, устаноўлены сучасныя і эфектыўныя катлы магутнасцю 3,1 і 0,5 МВт, якія працуюць на дранцы (адходах вытворчасці).

— На рэканструкцыю аб'екта было выдаткавана каля 2 мільёна рублёў, — расказаў **дырэктар КУП ЖКГ «Браслаў-камунальнік» Пётр БЯЛУСЬ.** — Сродкі выдзяляліся з рэспубліканскага і абласнога бюджэтаў, а таксама за кошт міжнароднай тэхнічнай дапамогі. Новыя катлы ў стане забяспечыць работу як падчас пікавай нагрузкі ў зімовы перыяд, так і летам толькі для падачы гарачага водазабеспячэння.

Рэканструяваная кацельня дапаможа раёну скараціць выкарыстанне імпартаванага прыроднага газу і палепшыць якасць спальвання мясцовых відаў паліва. Акрамя таго, амаль у два разы (з 35,1 да 19,2 тоны ў год) зменшацца і выкіды забруджвальных рэчываў.

Ліхтары на сонечных батарэях

Дзякуючы рэалізацыі праекта ўдалося скараціць і энергаспажыванне ў Браславе за кошт устаноўкі энергаэфектыўных святлодыёдных лямпаў на дзвюх вуліцах горада. А каля набярэжнай возера Дрывяты, дзе знаходзіцца адно з папулярных месцаў адпачынку, з'явіліся ліхтары на сонечных батарэях. Гэта невялікі папулярызацыйны праект, прысвечаны сучасным тэхналогіям.

— На кожным ліхтары са святлодыёднымі лямпамі ўсталявана сонечная панэль магутнасцю 240 ват, — расказвае **супрацоўнік энергетычнай праграмы ЦЭР Уладзімір РАК.** — Днём энергія, што выпрацоўваюць панэлі, перадаецца на акумулятар, ад якога і працуюць лямпы ў цёмны час сутак. І нават снежаньскага сонца хапае, каб асвятляць гэты ўчастак на працягу ўсёй ночы: панэль дастаткова вялікая, а святлодыёдныя лямпы спажываюць мала (каля 30 ват).

Сонечны калектар у дзіцячым садзе

З яго дапамогай установа адукацыі эканоміць электрычнасць на падаграванні вады і вучыць дзетак асновам энергазберажэння.

Па словах **каардынатара праекта ад ЦЭР Дзмітрыя БУРОНКІНА,** працаваць на гэтым аб'екце давялося шмат, і ў першую чаргу з-за вялікай адказнасці перад юнымі жыхарамі Браслава: аўтары доўга займаліся праектнай дакументацыяй, энергетычнымі аўдытамі, абмяркоўвалі ўстаноўку кожнага клапана, вентыля.

Параўнальныя даныя за сёлетні і леташні кастрычнік паказваюць: сістэма награвання вады з дапамогай сонечных калектараў закрывае палову спажывання электрабойлера. Агульная ж эканомія павінна скласці да 8,9 МВт·г у год.

— Сонечныя калектары дазваляюць істотна эканоміць: летам мы не ўключалі электраводанагравальнікі, — адзначыла **загадчык ДУА «Яслі-сад № 1 г. Браслава» Вольга ШЫМУКОВІЧ.**

Разам з устаноўкай калектараў праходзілі і шматлікія заняткі з выхаванцамі сада і іх бацькамі. Цяпер дзеці шмат ведаюць пра сонечную і геатэрмальную энергію, а таксама як яны дапамагаюць эканоміць прыродныя рэсурсы.

Акрамя таго, у межах праекта ўсталявалі пасудамыечную машыну, абсталяванне для эканоміі (змешвальнікі, аэратары і г. д.), а ў хуткім часе могуць з'явіцца параканвектаматы і іншыя прылады для кухні.

Турызм і энергазберажэнне ідуць побач

Па словах **старшыні Браслаўскага райвыканкама Аляксандра БАДАНІНА,** рэалізацыя гэтага і іншых праектаў дазваляе дасягнуць галоўнай мэты: стварыць камфортнае асяроддзе для жыхароў рэгіёна, захаваўшы чыстай мясцовую прыроду. А гэта магчыма праз змяншэнне выкідаў CO_2.

— Рэалізацыя праекта дазволіла нам гэта зрабіць, і гэта добры прыклад для грамадства, — падкрэсліў Аляксандр Баданін. — Па папярэдніх даных, у шматлікіх мерапрыемствах за апошні час прынялі ўдзел больш за 4000 жыхароў раёна.

У межах праекта была таксама распрацавана Стратэгія дасягнення кліматычнай нейтральнасці Браслаўскага раёна, дзе стаўка робіцца на ўдасканаленне энергетычнага сектара, укараненне аднаўляльных крыніц энергіі, актывізацыю энергазберажэння, развіццё арганічнай сельскай гаспадаркі, турызму (у тым ліку і аграэкатурызму) і стварэнне ў гэтых сферах новых рабочых месцаў.

Вераніка КОЛАСАВА.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А. А.,** старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л. А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В. М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А. Э.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В. В.**, старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т. Л.**, старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М. Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 292 44 12;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Тыраж 20.008. Нумар падпісаны ў 19.30 13 снежня 2018 года.